Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
__________С.Л. Шпарло
“20” 10 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД 426 /эвуч.

**ДЫРЫЖЫРАВАННЕ**

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-01 Народная творчасць(харавая музыка),*
*спецыяльнасці 1-18 01 01-01 02 Харавая музыка народная*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяьнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбнага плана БДУКМ па напрамку спецыяльнасці

**Складальнікі:**
*Л.Л. Ражкова,* загадчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук;
*Л.І.Холупава,* прафесар кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", дацэнт;
*П.А.Базылева,* выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".

**Рэцэнзенты:**

*Н.І.Ламановіч,* галоўны хормайстар дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы "Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь" народная артыстка Рэспублікі Беларусь;
*Т.С.Гажевская –Пешак,* дацэнт кафедры харавой музыкі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (протокол №10 ад 24. 05.2022);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (протокол №5 ад 15.06.2022).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма “Дырыжыраванне” распрацавана для спецыялізацыі 1-18 01 01-01-02 Харавая музыка народная.

“Дырыжыраванне” – цэласная сістэма ўзаемадзеяння ў музычным калектыве. Цэнтральным звяном гэтай сістэмы, яе яднаўчай асновай з'яўляецца мастацкі вынік, вакол якога каецэнтрыруюцца ўсе функцыі практычнай дзейнасці кіраўніка.

Вучэбная дысцыпліны “Дырыжыраванне” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: “Сальфеджыа”, “Гармонія”, “Аналіз музычных формаў і паліфанія”, «Фартэпіяна», «Пастаноўка голасу», «Хоразнаўства», «Харавы клас», «Методыка выкладання спецдысцыплін».

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – выхаванне дырыжора-выканаўца і дырыжора-выкладчыка, усебакова адукаванага музыканта, прапагандыста харавой, класічнай, сучаснай, народнай музыкі.

*Галоўнымі задачамі* вучэбнай дысцыпліны з'яўляюцца:

– авалоданне сродкамі і метадамі кіравання харавым калектывам на ўсіх этапах дырыжорскага працэсу;

– самастойная інтэрпрытацыя і ўвасабленне музычнага твора;

– авалоданне навыкамі рэпетыцыйнага дырыжыраваня;

– развіццё дырыжорска-выканальніцкіх навыкаў;

– выхаванне прафесійных і эмацыянальна-валявыя якасцей;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Спецінструмент” студэнт павінен *ведаць:*

– сутнасць і тэарэтычныя асновы дырыжорскага выканаўства;

– мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці асноўных этапаў вывучэння партытур музычных твораў;

– вобразна-эмацыянальны змест і драматургію твору;

– асаблівасці дырыжорскай тэхнікі, абумоўленай складам харавой партытуры;

– прыёмы рэпетыцыйнага дырыжыравання;

*умець:*

– дырыжыраваць творамі розных жанраў, стыляў па клавірах, партытурах;

– аналізаваць нотны тэкст з пункту гледжання музычна-тэарэтычных, мастацтка-выканальніцкіх асаблівасцей;

– скласці план паэтапнай работы над творам;

– свабодна карастацца ведамі па гісторыі і тэорыі музыцы пры распрацоўцы выканальніцкага плана;

– арганізаваць самастойныя заняткі па ўдасканаленню тэхнікі дырыжыравання і вызначыць іх змест, мэту і задачы;

– выканаць музычны твор па харавому на фартэпіяно, спец галасы і акорды.

*валодаць:*

– валодаць тэхнікай дырыжыравання і комплексам сродкаў кіравання харавым калектывам;
– нотным партытурным тэкстам;
– метадамі аналітычнага аналізу формы твора для ўвасаблення і раскрыцця музычнага вобраза.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “Дырыжыраванне” павінна забяспечыць фарміраванне базавай кампетэнцыі: выкарыстоўваць сродкі мастацкай выразнасці для рэалізацыі прафесійоных творчых замыслаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Дырыжыраванне” усяго адведзена 390 гадзін, з якіх 198 – аўдыторныя (індывідуыльныя) заняткі.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны.*

Змест і задачы вучэбнай дысцыпліны. Роля вучэбнай дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі. Вучэбна-метадычнае забяспячэнне вучэбнай дысцыпліны. Сутнасць і тэарэтычныя асновы дырыжорскага выканаўства. Дырыжыраванне як працэс кіравання калектыўным выкананнем.

## Тэма 1. *Паняцце аб аўфтакце. Аўфтакт як сродак кіравання выкананнем*

Аўфтакт , як аналаг дыхацельнага працэссу. Тры элементы ауфтакта – увага, дыхание, уступ. Аўфтакт, яго роля ў арганізацыі харавога гучання і функцыі ў кіраванні хорам.

Тэхналогія выканання поўнага і няпоўнага аўфтакта на розныя долі такта.

Набыццё навыкаў паказу ўступау і зняццяў харавых партый на кожную з долей. Авалодванне рознымі відамі аўфтактаў: пачатковы, міждольны. Вывучэнне прыёмаў паказу драблёнага, камбінаванага аўфтактаў, варыянты паказу затактавых уступаў, затрыманы ауфтакт

Асваенне навыкаў валодання аўфтактам, які выконвае выразныя функцыі (падрыхтоўку вяршыні "фразы, змену дынамікі, тэмпу, рытму, кульмінацыі і інш.).

Удасканальванне і пашырэнне прыёмаў паказу ауфтактаў, напаўненне іх разнастайнымі выразнымі магчымасцямі.

## Тэма 2. *Вывучэнне простых і складаных дырыжорскіх схем 3/4, 4/4, 2/4*

Авалодвае асновамі дырыжорскай тэхнікі на матэрыяле разнастайных па характары твораў простых і складаных памераў у схемах ***3/4, 4/4, 2/4***.
Галоўныя прынцыпы пры вывучэнні дырыжорскіх сетак:

- паслядоўнасць вывучэння ***3/4, 4/4, 2/4***
- графічная дакладнасць (яснасць) дырыжорскіх сетак;
- суадносіны моцных і слабых долей такта пры вядучай ролі моцнай долі;
- асэнсаванне дырыжорскай плоскасці і “кропкі” як асноўнага моманта фіксацыіі долей такта.
- актыўныя, пасіўныя рухі;

## Тэма 3. *Дырыжыраванне творамі з пераменнымі, складанымі, сіметрычнымі, несіметрычнымі памерамі*

Набыццё навыкаў дырыжыравання творамі з пераменнымі памерамі, у якіх чаргуюцца простыя (2/4, 3/4) і складаныя (4/4) памеры.

Патрэбнасць увагі да другой долі - асаблівасць тэхнічнага выканання твораў з пераменнымі памерамі.

Вывучэнне твораў са складанымі памерамі 6/8 і 6/4, які дырьгжыруюцца па шасцідольнай і двухдольнай схемах, 9/8 – па трохдольнай схеме з драбленнем і без яго, 12/8 – па чатырохдольнай схеме з драбленнем і без яго. Пры тактаванні схем з паказам кожнай метрычнай долі неабходна прытрымлівацца наступнага *правіла*: асноўны жэст на розныя долі выконваецца ўсёй рукой, ці рухам ад локця, паўторны жэст на гэтую долю-кісцевымі рухамі з мінімальнай амплітудай.

Рэпертуар дапаўняецца творамі, якія напісаны у пераменным метрам (6/8 і 4/4,3/4 і 9/8 і інш.).

Авалодванне навыкамі дырыжыравання складанымі сумяшчальнымі памерамі. Вывучэнне розных відаў груповак гэтых памераў, прыкладаў несіметрычнай групоўкі сіметрычных памераў. Дырыжыраванне харавымі творамі ў *пяцідольных* памерах з рознымі метрычнымі структурамі тактаў (3+2 і 2+3) па пяцідольнай схеме і ў сямідольных памерах (3+4 і 4+3) па сямідольнай схеме.

Вывучэнне складаных сумяшчальных памераў, розньгх варыянтаў скарочаных схем.

Авалодванне прыёмамі дырыжыравання "на раз" у памерах 2/4, 3/4, 3/8 у хуткім тэмпе. Для выпрацоўкі тэхнічных навыкаў дырыжыравання памерамі 8/8, 10/8, 13/8, 15/8 і іншых вельмі карысны нотны матэрыял беларускага песеннага фальклору.

Асэнсаванне паняцця “дырыжорская лінія”.

Асноўныя кампаненты дырыжорскай сеткі, схема і малюнак.

## Тэма 4. *Увасабленне штрыхоў featureрознага характару (legato, non legato, staccato, marcato,) у дырыжорскім жэсце*

Вывучэнне твораў з розным гукавядзеннем.

Засваенне тэхнікі паказу штрыхоў featureрознага характару (***legato, non legato, staccato, marcato***).

Прынцыпы падыходу да выбару дырыжорскага штрыха.

Тэхналогія перадачы штрыха праз характар жэста; розны характар кропак; накірункі (напрамак) атдачы; віды рухаў: паскораны, раўнамерны, запавольвальны.

Роля асацыятыўнага мыслення пры тэхнічным выкананні штрыхоў.

## Тэма 5. *Паняцце аб тэмпе. Адлюстраванне ў жэсце хуткіх і павольных тэмпаў*

Паняцце аб тэмпе. Класіфікацыя тэмпаў: хуткія, павольныя, сярэднія. Агульнапрынятая італьянская тэрміналогія і яе пераклад.

Узаемасувязь паміж тэмпам і вялічынёй жэста: чым хутчэйшы тэмп, тым меншая амплітуда руху. Роля кісці, прадплечча, пляча і ўсёй рукі.Ужыванне розных тыпаў атдачы.

Метраном, яго пабудова і прызначэнне. Выпрацоўка навыку знаходжання паказчыка метранома па гадзінніку. Здольнасць памятаць часта ўжываемыя тэмпы.

Тэмпавае паняцце агогікі (ritenuto, rallentando, accelerando, rubato і інш.), асаблівасці яе дырыжорскага ўвасаблення.

Змена дырыжорскай сеткі ў залежнасці ад змены тэмпу (пры ritenuto – сетка "на два" пераўтвараецца ў сетку "на чатыры", пры accelerando – сетка "на шэсць" пераходзіць у сетку "на два").

## Тэма 6. *Паняцце "дынаміка", асноўныя нюансы: pp, p, mp, mf, f, ff; crescendo, diminuendo; fp, pf sub.p, sub.f. Увасабленне ў дырыжорскім жэсце дынамічных адценняў*

*Дынаміка* – сродак выразнага эмацыянальнага выканання.

Ужыванне дынамічных адценняў ў залежнасці ад рознай ступені сілы і напружанасці гучання, ад іх раптоўнай або паступовай змене у падкрэсліванні асобных гукаў, акордаў і г.д.

Засваенне розых тыпаў дынамікі: рухомай, нерухомай, акцэнтаванай, кантрастнай.

Асноўныя прыёмы у паказе нерухомай дынамікі ***(pp, p, mp, mf. f, ff. )*** :

• большая або меншая велічыня націску;

• большая або меншая даўжыня вертыкалі і гарызанталі замаху;

• аддаленыя ад корпуса або прыбліжаныя да сябе рукі;

• выкарыстанне масы ўсёй рукі, яе частак або кісці;

• у хуткіх тэмпах у час змены дынамікі пераход рук у другую плоскасць;

• большая або меншая насычанасць, інтэнсіўнасць жэста.

Выбар дырыжорскіх прыёмаў для рухомай дынамікі *(crescendo, diminuendo).* Галоўны прынцып – раўнамернасць ў пераходах ад меншай сілы гучання да большай і наадварот (нязменны тэмп).

Роля інтэнсіўнасці і амплітуды рухаў; змены плоскасці тактавання.

Выбар дырыжорскіх прыёмаў для кантрастнай дынамікі ***(fp, pf sub.p, sub.f)*** Роля характара, амплітуды жэста; змены плоскасці, мімікі і накіраванасці корпуса. Неабходнасць у папярэджванні хору аб змене нюансу ( жэстамі левай рукі і мімікай).

Асноўныя прыёмы ваканання ***sub.f***: рэзкая змена аб'ёму жэста і плоскасці тактавання; раптоўнае прыбліжэнне рукі да сябе або аддаленнем ад сябе.

Перасцерагальны жэст – асноўны элемент тэхнікі выканання кантрастнай дынамікі.

### Тэма 7. *Авалодванне тэхнічнымі прыёмамі паказу акцентаў, сінкоп, фермат, паўз*

*Акцэнт* (націск). Класіфікацыя найбольш распаўсюджаных акцэнтаў – (tenuto), >, ***sf***.

Асноўная характарыстыка жэста і тэхніка выканання акцэнтаў.

*Сінкопа* (скарачэнне). Тэхнічныя асаблівасці спосабу паказа – момант «трампліна»( адскок рукі ад долі перад сінкопай).

Прыёмы выканання ўнутры-тактавай і ўнутры-долевой сінкопы.

*Фермата(* прыпынак*)*. Выпрацоўка навыкаў тэхнічнага выканання розных тыпаў фермат: ферматы, якія здымаюцца ў сярэдзіне, у пачатку і ў канцы твора; ферматы, якія не здымаюцца; ферматы на паўзе.

Роля папярэдняга ауфтакта, залежнасць характару аўфтакта ад віду ферматы.

*Паўза* (знак маўчання) Неабходнасць класіфікаціі паўзаў па сэнсаваму успрыманню: паўза- сцвярджэнне, паўза-пытанне, паўза – роздум і г. д.

Узаімасувязь тэхнічнага выканання ад псіхалагічнага назначэння паузы.

### Тэма 8. *Раздзяленне функцый рук, іх каардынацыя*

Набыццё навыкаў пачатковага раздзялення функцый рук.

Самастойная роля рук пры паказе вытрыманых долей, размеркаванне тэматычнага матэрыялу.

Авалодванне навыкамі выразнага паказу асаблівасцей метрарытмічнага малюнка розных харавых партый на аснове самастойнага руху рук.

Удасканальванне тактавання правай рукой пры розным унутрыдолевым напаўненні (восьмымі, шаснаццатымі, трыёлямі, секстолямі і інш.).

Узбагачэнне функцыі левай рукі пры фразіроўцы, арганізацыі інтаацыйнага працэса, паказе дынамічных кантрастаў, кіраванні вакальным бокам выканання, доўгім *crescendo, diminuendo*, інтэнсіўнасці гуку, агагічных змяненнях.

Узаемазамяняльнасць функцый рук, незалежнасць іх дзеянняў, каардынаваная незалежнасць.

### Тэма 9. *Музычны вобраз і яго дырыжорскае увасабленне*

Вобразнае мысленне – пафесійная анова дырыжыравання.

Класіфікація і структура вобразна - выразных сродкаў выканання. Характар і структура выразнага жэста.Залежнасць вобразнасці жэста ад “масы” гучання, каларыта, насычанасці і г.д. Узаемасувязь характара накіраванасці (устремлённости) рухаў жэста з актыўнасцю мыслення.

Усвядамленне структуры фразы і яе тэхнічнага увасаблення. Роля кісці, прадплечча, пляча і ўсёй рукі ; рознага узроўня плоскаці.

Развіццё здольнасці адчуваць вобразнасць музыкі, яе сэнсаваю змястоўнасць; ужыванне метада супастаўлення.

Глыбокае пасціжэнне і трактоўка-інтэрпрытацыя харавога твора – аснова правільнага выбара сродкаў выразнасці.

### Тэма 10. *Методыка работы над харавой партытурай*

Значэннне папярэдняга вывучэння харавой партытуры.

Тры узроўні вывучэння партытуры: элементарны аналіз; фрагментальны аналіз; цэласнае успрыманне – пасцяжэнне.

Чатыры асноўных этапа работы над харавой партытурай: вакальны, інструментальны, аналітычны і дырыжорскі.

Асноўныя раздзелы плана аналіза харавой партытуры : *гістарычна-стылістычны аналіз; аналіз паэтычнага тэксту; музычна-тэарэтычны аналіз; вакальна-харавы аналіз;дырыжорска-тэхнічны аналіз; выканаўчы аналіз.*

Агульныя патрабаванні да правядзення аналізу харавога твора:

- музычна-выразныя сродкі разглядаюцца ва узаемасувязі і мастацкім адзінстве з тэкстам;
- кожная пабудова(або частка, раздзел)аналізуецца з розных бакоў – даецца цэласная характарыстыка;
- аналіз праводзіцца у напрамку ад выразнага эфекту, да тых сродкаў, якімі ён здзейснены.

Вынік аналізу – уменне эстэтычна ацаніць харавы твор, прааналізаваць, вызначыўшы яго мастацка – вобразнае ўспрыманне, сродкі дырыжорскай выразнасці, знайсці аптымальныя шляхі ўвасаблення ідэйна-мастацкай задумы ў рэальным гучанні.

### Тэма 11. *Стыль, жанр, інтэрпрытацыя*

Вывучэнне харавых твораў з пункту гледжання стылявых і жанравых заканамернасцей, іх уплыву на дырыжорскую інтэрпрэтацыю.

Музычны стыль як сістэма музычнага мыслення, ідэйна – мастацкіх канцэпцый, комплекс змястоўных сродкаў выразнасці іх увасаблення .

Аналіз элементаў, які прадстаўляе даны стыль, іх сувязь паміж сабой у параўнанні с іншымі стылямі.

Дзяленне жанраў і жанравых форм па характару зместа: эпічны, лірычны, драматычны.

Па спосабу выканнння: вакальны, інструментальны. Выяўленне жанраў – рашаючы фактар для вызначэння характара выканання харавых твораў.

Залежнасць дырыжорскага бачання ад жанрава-стылявых асаблівасцей харавога твора.

Усведамленне заканамернасцей выкарыстання *розных мадыфікацый* тэмпа, дынамікі, штрыхоў, тэмбра, характара фразіроўкі – неабходная умова інтэрпрытацыі харавога твора.

**Тэма 12.** ***Асваенне тэхнікі рэпетыцыйнага дырыжыравання***

Набыццё навыкаў рэпетыцыйнага дырыжыравання і сістэмы рэпетыцыйных дырыжорскіх жэстаў:

– падкрэслена просты, выразны і ясны "метрарытмічны" малюнак дырыжрскай схемы;

– часовае адмаўленне ад дырыжорскіх сетак пры фіксацыі тэкставых і вакальна-харавых цяжкасцей пры рабоце над партытурай (пабудова на фермаце гучання якога-небудзь акорда, які патрабуе праверкі, выраўноўванне ансамбля і г.д.);

– павелічэнне амплітуды руху (для развіцця актывізацыі дыхання, эмацыянальнага стану і інш.);

– змяненне характара жэста пры рабоце над штрыхамі (legato, staccato, marcato);

– навык рацыянальнага ўключэння запаволенага тэмпу калі трэба пераадолець тэхнічныя, інтанацыйныя ці рытмічныя цяжкасці т.д.)

– выключэнне знешней праявы сваёй эмацыйнай узрушанасці, засяроджванжне ўвага на рацыянальным слыхавым і зрокавым кантролі ўсіх фактурных элементаў партытуры;

– выкарыстанне прыёмаў хейраноміі

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № п/п | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | УСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Індывідуальныя | | |
| | Уводзіны. | 2 | | |
| Тэма 1 | Паняцце аб аўфтакце. Аўфтакт як сродак кіравання выкананнем. | 14 | 6 | Кантрольны урок |
| Тэма 2 | Вывучэнне простых і складаных дырыжорскіх схем 3/4, 4/4, 2/4. | 14 | 6 | Пісьмовае заданне |
| Тэма 3 | Дырыжыраванне творамі з пераменнымі,складанымі,сіметрычнымі, несіметрычнымі памерамі. | 20 | 8 | Пісьмовае заданне |
| Тэма 4 | Увасабленне штрыхоў featureзнага характару (legato, non legato, staccato, marcato,) у дырыжорскім жэсце | 14 | | |
| Тэма 5 | Паняцце аб тэмпе. Адлюстраванне ў жэсце хуткіх і павольных тэмпаў | 18 | 8 | Тэхнічны злік |
| Тэма 6 | Паняцце “дынаміка”, асноўныя нюансы: f, p, mf, mp, ff, pp, sub p. Увасабленне ў дырыжорскім жэсце дынамічных адценняў | 18 | 8 | Кантрольны урок |
| Тэма 7 | Авалодванне тэхнічнымі прыёмамі паказу акцентаў, сінкоп, фермат, пауз | 12 | | |
| Тэма 8 | Раздзяленне функцый рук, іх каардынацыя | 10 | | |
| Тэма 9 | Спецыфіка засваення тэхнікі рэпетыцыйнага дырыжыравання. | 18 | 4 | Кантрольны урок |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 10 | Методыка работы над харавой партытурай | 6 | | |
| Тэма 11 | Стыль, жанр, інтэрпрытацыя | 6 | | |
| Тэма 12 | Музычны вобраз і яго дырыжорскае увасабленне | 6 | | |
| | **Усяго: 198** | **158** | **40** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

*Асноўная літаратура*

1. Ержемский Г. Психология дирижирования. Некоторые вопросы исполнительства и творческого взаимодействия дирижера с музыкальным колективом/ Г. Ержемский. – М.: Музыка, 1984. – 79 с.
2. Мусин, И. А. О воспитании дирижера: очерки/ И. А. Мусин. – Ленинград: Издательство «Музыка», 1987. – 246 с.
3. Мусин, И. А. Техника дирижирования : практ. руководство. / И. А. Мусин –2-е изд., доп. – СПб.: Просвет.-изд. центр «Деан – АДИА-М», 1995. – 295 с.
4. Ольхов, К. Теоретические основы дирижерской техники/ К. Ольхов. – 3-е изд. – Л.: Музыка, 1990. - 199 с.
5. Холупава Л.И. Методика преподавания спецдисциплин: курс лекций/Л.И.Холупова. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 140 с.
6. Хрестоматия по хоровому дирижированию : в 2 т. Т. 1. Сложные симетричные размеры: хоры a cappella: учеб.-метод. Пособие /сост.: Л.И. Холупова, Е.И. Дубовец, И.В. Селина; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск: БГУКИ, 2018. – 303 с.

*Дадатковая літаратура*

*Асафьев, Б.В.* О хоровом искусстве/ Б.В. Асафьев. – Л.: Музыка, 1980. – 216с.

*Баренбойм, Л.А.* Музыкальная педагогика и исполнительство/ Л.А. Баренбойм . – Л.: Музыка, Ленинградское отделение 1974 г. –335с.

*Баренбойм, Л.А* .Путь к музицированию /Л.А. Баренбойм. – Л.: Советский композитор, 1979. –350с.

*Гинзбург, Л. М* Дирижёрское исполнительство: Практика история эстетика/ Л. М Гинзбург. – Л.: Музыка,1975. –630с.

*Казачков, С.А.* Дирижерский аппарат и его постановка/ С.А.Казачков. – М.: Музыка, 1967. – 130 с.

*Левандо, П.П.* Хоровая фактура: Монография./ П.П. Левандо. – Л.: Музыка, 1984. – 51-68с.

*Мусин, И. А.* О воспитании дирижера: Очерки/ И. А. Мусин.- Л.: Музыка, 1987. – 246 с.

*Петрушин, В. И.* Музыкальная психология/ В. И Петрушин. –Москва, 1997. – 383с.

*Романовский, Н.В.* Хоровой словарь/ Н. Б. Романовский –М.: Музыка, 2000. – 228 с.

*Сіманоўская, І.М.* Харавое дырыжыраванне: вучэбна-метадычны дапаможнік / І. М.Сіманоўская. – Мінск, 2005. – 83с.

*Шиманович, Л.А.* Практические формы работы в классе хорового дирижирования/ Л. А.Шиманович. – Минск, 1987. – 30с.

*Хайкин,Б.Э.* Беседы о дирижерском ремесле: Статьи/ Б. Э.Хайкин. – М.: Сов. композитор, 1994. – 240с.

*Нотная літаратура*

*1. Дробыш, С.І.* Дырыжыраванне: хрэстаматыя для народнага хору / С.І.Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.І.Холупава.- Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008.- 297 с.

*2. Дробыш, С.І.* "І песню родную люблю я…": вучэб.-метадыч. дапам. С.І.Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.І.Холупава.-Мн.: Друкарня РУП "Промпечать", 2008.- 120 с.

*3. Дробыш, С.І.* Хрэстаматыя па дырыжыраванню народным хорам / С.І. Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.М.Міхліна.- Мн.: "Беларусь", 1991.- 143 с.

*4. Несцяровіч, Г.Д.* Ансамбль беларускай народнай песні: вучэб. дапам. / Г.Д.Несцяровіч, Л.І.Холупава, А.І.Дубавец.- Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006.- 152 с.

*Прыкладны рэпертуар*

***Творы для народного хору***

*Беларуская народная песня.* Ой, у полі пры даліне. Апр. К.Паплаўскага.

*Беларуская народная песня.* Шумяць вербы. Апр. Г.Сарока.

*Беларускі канты.* Нова радасць стала. Неба і зямля. Апр. У. Зяневіча.

*Кутузаў М.* Бяроза.

*Лацеў В.* Курганы.

*Пятрэнка М.* Партызанскі бор.

*Равенскі М.* Люблю наш край. Апр. М Дрынеўскага.

*Руская народная песня.* За рэчанькай дзіва. Апр. М. Кутузава

*Семяняка Ю.* За ўсё ўдзячны ім.

***Творы для акадэмічнага хору***

*Азалінь Я.* Серабрыстыя сляды.

*Барадзін А.* Опера "Князь Ігар", хор жанчын "Адлятай на крылах ветру".

*Вагнер Г.* Дуб.

*Вэрдзі Дж.* Опера "Макбет", фінальны хор.

*Даргамыжскі А.* Опера "Русалка", хор "Як у горніцы".

*Іпалітаў-Іванаў А.* Сасна.

*Каваль М.* Даліна-далінушка.

*Ляташынскі Б.* Па небе крадзецца месяц.

*МарцініП.* Восень.

*Новікаў А.* Кантата "Чырвонай Арміі - слава", частка "Рэквіем".

*Руская народная песня.* Гаварыў жа мне. Апр. А.Міхайлава. *Сяроў А.* Опера "Рагнеда", хор "Застагнала сіне мора".

*Фляркоўскі А.* У сё так спакойна.
*Шабалін В.* Опера "Утаймаванне свавольніцы", вясельны хор.
*Шабалін В.* Палынок. *Шабалін В.* Уцёс. *Шуман Р.* Вячэрняя зорка.

**Творы для хору ў памеры 2/4**

*Вэбер К.* Опера "Вольны стралок", хор паляўнічых.
*Гершвін Дж.* Да Радзімы.
*Грачанінаў А.* Совачкіна вяселле.
*Даргамыжскі А.* Опера "Русалка", хары "Люба нам", "Цішэй-цішэй".
*Калліннікаў В.* Праходзіць лета.
*КалліннікаўВ.* Жаўрук. *Калліннікаў В.* Кондар.
*Мусаргскі М.* Опера "Сарачынскі кірмаш", "Гапак".
*Украінская народная песня.* Казака нясуць. Апр. А.Леантовіча.
*Часнакоў П.* Сялянская гулянка.
*Шчадрын Р.* Ціхая ўкраінская ноч.

**Творы для хору ў памеры 3/4**

*Беларуская народная песня.* Ой, вяцёр вее. Апр. М. Сіраты.
*Данькевіч К.* Опера "Багдан Хмяльніцкі", хор жанчын 'Чорны воран".
*Каваль М.* Слёзы.
*Кампанеец Л.* Вясенняя навальніца.
*Нікольскі А.* Ранены арол.
*Чайкоўскі П.* Опера "Арлеанская дзева", хор дзяўчат 'Пакуль на небе".
*Часнакоў П.* Ранкам зорка.
*ЧаснакоўП.* Ходзяць у небе ціхенька...
*Шуман Р.* Начная цішыня.

**Творы для хору ў памеры 4/4**

*Бойка Р.* Ты заспявай мне тую песню.
*Лапцеў В.* Вутачкі.
*Пятрэнка М.* Прарыў.
*Семяняка У.* Якая ты цудоўная, Радзіма.
*Шапорин А.* Опера "Дзекабрысты", хор "За Дунаем, за ракой"

**Творы для хору ў пераменных памерах 3/4, 4/4, 2/4**

*Беларуская народная песня.* Ой ты, белая бяроза. Апр. М.Сіраты.
*Беларускія народныя песні.* Ой, рана на Йвана. Ночы, мае ночушкі. Апр. М. Дрынеўскага
*ГрачанінаўА.* Опера "Дабрыня Мікіціч", фінал 1-й дзеі.
*Іконнік В.* Ноч.
*Каваль М.* Араторыя "Сказ пра партызана", 3-я і 4-я песні.
*КалліннікаўВ.* Зіма.
*Кузняцоў І.* А я не верыла рабіне.
*Кутузаў М.* Куды б ні йшоў...
*Лапцеў В.* Вутачкі.

*Масаліцінаў К.* Чаромха духмяная.

*Масалоў А.* Нівы зжатыя.

*Ï ракоф'еў С.* Араторыя "Аляксандр Неўскі", песня аб А.Неўскім.

*Пятрэнка М.* Невядомы партызан.

*Рахманінаў С.* Слава народу.

*Рускія народныя песні.* Што гарыць, гарыць. У чаратах лябёдачка. Апр. В. Левашова.

*Руская народная песня.* Ой, ва поле травушка гарэла. Апрацоўка С.Чарнабая

*Ушкароў А.* Чараты.

*Фляркоўскі А.* Вячэрні лес яшчэ не спіць.

*Хаўхлянцаў М.* Вочы Беларусі.

*Часнакоў П.* Не кветачка ў полі вяне.

***Творы для хору у памерах 6/4 і 6/8 па двухдольной і шасцідольнай схемах***

*Аляксандраў Ю.* Прачынаецца мора.

*Беларускія народныя песні.* Вярба, вярба. На гарэ дубочак. Апр. М.Сіраты..

*Беларуская народная песня.* Заспявай, жавароначак. Апр. К.Паплаўскага.

*Беларускія народныя песні.* Лятуць, лятуць два лебедзі. Купалялё. Апр. С. Беражнога.

*Беларуская народная песня.* Ой, я ў полі лянок брала. Апр. А. Кулакоўскай.

*Беларуская народная песня.* Хто за дваром. Апр. В. Кузняцова.

*Гайдн І.* Араторыя "Поры года", хор землляробаў.

*Даргамыжскі А.* Опера "Русалка", хор "Свабодным натоўпам".

*Іпалітау-Іванау.* Ноч.

*Моцарт В.* Опера "Ідаменей", хор "Спіць бестурботна мора".

*Напраўнік Э.* Опера "Ніжагародцы", хор "Старана, старонка".

*Рубінштэйн А.* Опера "Дэман", хор "Ночанька".

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Ноч перад Ражаством", сцэна Аўсеня і Каляды.

*Салманаў В* Песня.

*Свірыдаў Г.* Паэма памяці Сяргея Ясеніна, частка "Малацьба".

*Фляркоўскі А.* Над ручаём.

*Чайкоўскі П.* Опера "Арлеанская дзева", гімн.

*Шуберт Ф.* Далёкай.

*Шуберт Ф.* Любоў.

*Шуберт Ф.* Меса G- dur, частка Benediktus.

***Творы з пераменнымі памерамі (6/8, 9/8,12/8)***

*Грачанінаў А.* Пралеска.

*Гуно Ш.* Опера "Фауст", марш салдат.

*Камінскі В.* Калі прачынаецца мора.

*Карызна У.* Таемнасць цішыні. На небе месяц стаў зялёны.

*Кузняцоў І.* Балада аб маці.

*Кюі Ц.* Засвяцiласая ўдалечыні.

*Парцхаладзэ М.* Люты ці май.

*Рахманінаў С.* Анёл. Сасна.

*СвірыдаўГ.* Паэма памяці Сяргея Ясеніна, частка "Спявае зіма".

*Семяняка Ю.* Люблю цябе, Белая Русь.

*Сірата М.* Добрай ночы, зара-зараніца.

*Сняткоў Б.* Запавет паэта. Раніца.

*Чайкоўскі П.* Кантата "Масква", частка першая "З малой крынічкі".

*Чайкоўскі П.* Опера "Апрычнік", хор "Часы насталі злыя".

*ЧаснакоўП.* Хары "Лісце", "Яблыня", "Ноч".

*Часнакоў П.* " Цепліцца зорка"

***Творы для народного і акадэмічнага хароў у пяцідольным памеры***

*БацяроўЯ.* У небе таюць аблокі.

*Беларуская народная песня.* Закаці, закаці, яснае сонейка. Апр. К.Паплаўскага.

*Беларуская народная песня.* Ой, павей, буйны вецярочак. Апр. К.Паплаўскага.

*Беларускія народный песні.* Рэчанька, У зялёнай дуброве. Апр. Г.Цітовіча.

*Беларуская народная песня.* Што за лесам. Апр. М. Сіраты.

*Беларуская народная песня.* Ой, выйду ж я на вуліцу. Апр. Э. Наско.

*Брытан Б.* Кароткая меса, Agnus Dei.

*Буцко Ю.* Калёда-малёда.

*Буцко Ю.* Кантата "Вясельныя песні", "Каля церама".

*Даргамыжскі А.* Опера "Рагдана", хор дзяўчат "Як дзянніца з'явіцца".

*Каваль М.* Араторыя "Емяльян Пугачоў", хор "Званы-стогны".

*Лапцеў В.* Пагасала красна сонейка.

*Людзіг М.* Лес.

*Наско Э.* Не кувай ты, шэрая зязюля.

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Пскавіцянка", хор "Па маліну, па смародзіну".

*Свірыдаў Г.* Кантата "Курскія песні", частка "Салавей мой смутны".

*Чайкоўскі П.* Опера "Ваявода", заключны хор "Слава".

*Чайкоўскі П.* Опера "Мазепа", хор дзяўчат "Я заўю, заўю вянок".

*Чайкоўскі П.* Опера "Чаравічкі", хор русалак.

*Чайкоўскі П.* Опера "Чарадзейка", хор гасцей "Нам не дарага піва хмельнае".

***Творы для народного і акадэмічнага хароў у сямідольным памеры***

*Барадзін А.* Песні цёмнага лесу.

*Беларуская народная песня.* У нас сёння купалачка. Апр. У.Зяневіча.

*Беларуская народная песня.* Балада аб партызанцы Галіне. Апр. М.Сіраты.

*Беларуская народная песня.* Ой, там, на гары. Апр.М.Сіраты.

*Беларуская народная песня.* Пойдзем, дзевачкі. Апр. У.Зяневіча.

*Руская народная песня.* Уж вы, мае ветры, вецярочкі. Апр. С.Папова.

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Казка пра цара Салтана", хор "Што так рана"

*Сяро ў А.* Опера "Рагнеда", хор паляўнічых.

*Украінская народная песня.* Ціха над рэчкаю. Апр. А.Ленскага.

*Шапорын Ю.* Сімфонія-кантата "На полі Куліковым", хор "Рака раскінулася".

**_Творы для народного і акадэмічнага хароўу памеры 7/8/і 7/4 (дырыжыруюцца па трохдольнай схеме)_**

*Беларуская народная песня.* Там на гарэ Купалле. Апр. Г. Несцяровіч.

*Беларуская народная песня.* Цераз бор-бары. Апр. М. Сіраты.

*Беларуская народная песня.* А ў ляску, ляску. Апр. А. Рашчынскага.

*Беларуская народная песня.* Як едуць сваты. Апр. В. Кузняцова.

*Балгарская народная песня.* Ручаніца. Апр. Д.Хрыстава.

*Брытан Б.* Кароткая меса, частка "Gloria".

*Данілаў В.* Завіруха.

*Ленскі А.* Опера "Якаў Шабалок", хор станічнікаў.

*Рускія народныя песні.* Ай, пчолка, пчолка ярая. Цвілі ў полі кветачкі. Апр. Ю.Буцко.

*Свірыдаў Г.* Кантата "Курскія песні" частка №7 "За рэчкаю".

*Стравінскі І.* Ойча наш.

Холмінаў А. Опера "Чапаеў", хор "У нас Пецечка".

**_Творы для народного і акадэмічнага хароў у памерах 5/8/ і 5/4 (дырыжыруюцца па двухдольнай схеме)_**

*Аракішвілі Д.* Аб паэце.

*Аруцюнян А.* Кантата "Аб Радзіме", хор "Трыумф працы".

*Беларуская народная песня.* Кукавала зязюля. Апр. К.Паплаўскага.

*Васіленка С.* Дафіна віно.

*Кочатаў В.* Як у нас было на вуліцы.

*Ленскі А.* Ой, ляцелі гусі.

*Масалоў А.* Стрэл.

*МоўчанА.* Гусляр.

*Пракоф'еў С.* Опера "Любоў да трох апельсінаў", хор медыкаў.

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Казка пра цара Салтана", хор "З моцны дуб табе павырасці".

*Холмінаў А.* Опера "Аптымістычная трагедыя", хор анархістаў.

*Чулакі М.* Кантата "На берагах Волхава", хор партызан.

*ЭманаўА.* Праляталі гусі-лебедзі.

***Творы для народнага і акадэмічнага хароў, якія дырыжыруюцца з драбленнем кожнай метрычнай долі***

*Беларуская народная песня.* Пасеялі дзеўкі лён. Апр. А.Стэцэнкі.

*Гайдн І.* Нэльсан-меса, часткі “Qui tollis”, “ Et incarmatus est “

*Гендэль Г.* Dignare.

*Моцарт В.* Меса-брэвіс, D-dur, частка "Et incarnates est".

*Моцарт В.* Рэквіем, частка “Lacrimosa “

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Снягурачка", хор "Не быў ні разу зняважаны здрадаю".

*Чайкоўскі П.* Опера "Апрычнік", хор "На моры вутачка купал ася".

*Чайкоўскі П.* Опера "Чарадзейка", хор "Рассадзіць ці бяду..."

**Творы для народнага і акадэмічнага хароў, напісаныя ў складаных памерах з несіметрычнай групоўкай у такце**

*Алоўнікаў У* Вяселле.

*Карганаў Т.* Прывідны месяц.

*Ленскі А.* Провады маладой, Маслянічная.

*Македонская народная песня.* Йшла дзявіца за вадой". Апр. В.Сіліча.

*Месіян А.* Харал.

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Садко", хор 'Той ты, Сад-Садко".

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Сказание аб нябачным градзе Кіцежы", хор "Ой, бяда ідзе, людзі".

*Украінская народная песня.* Круты бераг. Апр. Ф.Казіцкага.

*Фалік Ю.* Карэльская акварэль.

***Творы для народнага і акадэмічнага хароў, якія дырыжыруюцца на "раз"***

*Беларуская народная песня.* Ды што ў садзе лялеіцца. Апр. Г.Цітовіча.

*Брамс І.* Вальс.

*Васіленка С.* Опера "Сказание аб нябачным градзе Кіцежы", хор народа.

*Гуно Ш.* Опера "Фауст", вальс.

*Мельнік І.* Хто, хвалі, вас спыніў.

*Мусаргскі М.* Хор "Цар Эдып".

*Нішчынскі П.* Закувала сіва зязюля.

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Майская ноч", хор "Песня пра Галаву".

*Чайкоўскі П.* Опера "Яўген Анегін", інтрадукцыя і вальс.

***Рекомендуемы рэпертуар для заключнага экзамену па дырыжыраванні Хары a'cappeiia***

*АрэнскıА.* Анчар.

*Беларуская народная песня.* Ой ты, сонца яснае. Апр. М.Сіраты.

*Беларускія народныя песні.* Ой ты, грушка. Ночы мае, ночушкі. Апр. М.Дрынеўскага.

*Беларуская народная песня.* Вой шурыцца, вой бурыцца. Апр. У. Маслакова.

*Брукнер А.* Ave Maria.

*Грачанінаў А.* Поўнач і поўдзень.

*Дарзінь В.* Зламаныя сосны. Былое.

*Каваль М.* Лісце.

*Калліннікаў В.* Восень. Зоркі цямнеюць і гаснуць. Нам зоркі лагодна ззялі.

*Ленскі А.* 9 студзеня, Былое.

*Ушкароў А.* Думы мае, думы.

*Свірыдаў Г.* Сустрэліся сын з бацькам.

*Семяняка Ю.* Вы чулі, як плачуць дрэвы?

*Танееў С.* Усход сонца. Вечар. Паглядзі, якая імгла.

*Часнакоў П.* Цепліцца зорка. Жнівень. Альпы. Зімой.

*Чурлёніс М.* Sanktus.

***Хары з суправаджэннем***

*Багатыроў А.* Кантата "Беларускім партызанам".

*Барадзін А.* Опера "Князь Ігар", сцэна ў Галіцкага, палавецкі акт.

*Бізэ Ж.* Опера "Кармэн", сцэна першая з першай дзеі, сцэна карыды з чацвёртай дзеі.

*Брамс І.* Нямецкі рэквіем, частка 6.

*Вэрдзі Дж.* Опера "Дон Карлас", фінал другой дзеі. Опера "Аіда", фінал другой дзеі. Опера “Атэла”, сцэна буры. "Рэквіем", частка 1.

*Гайдн І.* Нельсан-меса, часткі "Кугіе", "Gloria". Араторыя "Поры года",№ 19.

*Глінка М.* Опера "Іван Сусанін", польскі акт.

*Грачанінаў А.* Опера "Дабрыня Мікіціч", сцэна провадаў Дабрыні.

*Гуно Ш.* Опера “Фауст”, сцена “Смерць Валенціна.”

*Казлоўскі В.* Рэквіем, частка 1,2.

*Мусаргскі М.* Опера "Барыс Гадуноў", сцэна пад Кромамі. Хор "Паражэнне Сенахерыба".

*Рымскі-Корсакаў М.* Опера "Царская нявеста", сцэна "Прыварожнае зелле".

*Салманаў В.* Араторыя "Дванаццаць", часткі № 2, 12.

*Фарэ Г.* Рэквіем, частка "Libera me".

*Чайкоўскі П.* Опера "Мазепа", сцэна пакарання смерцю.

*Шуберт Ф.* Меса, G-dur, частка "Gloria".

### *Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі*

– вуснае апытанне ў час заняткаў ( пытанні, якія тычацца дырыжыруемых твораў, так і твораў, якія праходзіліся напрацягу ўсяго семестра: хар-ка творчасці кампазітара, паэта, змест твора, стыль, форма, і інш.).

– выкананне партытуры твора на фартэпіяна а cappella па харавому;

– спяванне са славамі на памяць, ці сальфеджыю адну з названых харавых партый; 2-3 пачатковых, ці завяршаючых акорда (твор а cappella) па вертыкалі;

– адказы на пытанні па мастацкаму і тэхнічнаму увасабленню харавога твора;

– пісьмовыя работы (анатацыі на твор а cappella- вакальна-харавы і выканаўчы аналіз харавых партытур);

– тэхнічныя залікі па асобных раздзелах дысцыпліны.

### *Метады і тэхналогіі навучання*

– Выкладанне вучэбнай дысцыпліны "Дырыжыраванне" ажыццяўляецца з выкарыстаннем розных метадаў:

– тэарэтычных і агульналагічных (сістэматызацыі, класіфікацыі, параўнальнага аналізу, сінтэзу, абагульнення);

– тлумачальна-ілюстрацыйнага ў спалучэнні з рэпрадуктыўным.

– на практычных занятках мэтазгодна прымяняць інтэрактыўныя метады навучання: работу з дыдактычнымі матэрыяламі, дыскусіі і абмеркаванні, разбор канкрэтных вучэбна-метадычных сітуацый, праектаванне навучальных заняткаў і г. д. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій навучання тэлекамунікацыйных сетак) дазволіць зрабіць аўдыторныя заняткі цікавейшымі і эфектыўнымі. Сярод форм ужывання камп'ютарных тэхналогій

– дэманстрацыя мультымедыйных прэзентацый, праслухоўванне і прагляд аўдыё- і відэаматэрыялаў, праца з рэсурсамі сеткі Інтэрнэт, электроннымі энцыклапедыямі і інш. Важным уяўляецца і ўлік міждысцыплінарных сувязяў. Пастаянны зварот да іншых тэарэтычных і практычных дысцыплін дазволіць растлумачыць навучальны матэрыял і замацаваць заняткі, якія засвойваюцца студэнтамі.

### *Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай працы студэнта*

– Самастойная работа студэнтаў садзейнічае паглыбленню іх ведаў, пашырэнню кругагляду, фарміраванню навыкаў самастойнага пошуку і апрацоўкі інфармацыі, выпрацоўцы творчага падыходу да асваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў у рамках вучэбнай дысцыпліны "Дырыжыраванне" уключае ў сябе наступныя формы:

– выкарыстанне відэа-і аўдыёматэрыялаў;
– падрыхтоўка да індывідуальных заняткаў і іспыту.

Вывучэнне матэрыялу навучальнай дысцыпліны мае на ўвазе працу студэнтаў з друкаванай літаратурай і рознымі інфармацыйнымі рэсурсамі сеткі Інтэрнет. Вывучэнне дадатковых матэрыялаў па індывідуальным спісе (з улікам базавай адукацыі).

Выкарыстанне відэа- і аўдыёматэрыялаў – адна з важных форм самастойнай працы ў рамках навучальнай дысцыпліны "Спецінструмент". Яно заключаецца ў пошуку, праглядзе, праслухоўванні і аналізе выступленняў розных калектываў і майстар-класаў вядомых выканаўцаў і педагогаў-духавікоў.

Падрыхтоўка да індывідуальных заняткаў і іспыту патрабуе адказных адносін і рэгулярнай працы над замацаваннем ведаў, атрыманых падчас аўдыторных заняткаў, творчага падыходу (выкананне практычных заданняў пры падрыхтоўцы), а таксама глыбокага вывучэння студэнтамі рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры. У працэсе самастойнай працы студэнт падбірае нотныя прыклады (якія дазваляюць праілюстраваць асаблівасці выканальніцкай тэхнікі, спецыфікі трактоўкі і інтэрпрэтацыі твораў для духавых інструментаў), практыкаванні для правільнай пастаноўкі дыхання, сістэматызуе спосабы працы над інструктыўным матэрыялам, падбірае практыкаванні для развіцця тэхнікі пальцаў (як у працэсе самастойнага разбору, так і з ансамблевым калектывам).

Карыстанне нотным матэрыялам для студэнтаў абавязковае не толькі падчас самастойнай працы на інструментах, а так сама пры праслухоўванні музыкі.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ЭКЗАМЕНА

**1**. Прадырыжыраваць 2 творы: без суправаджэння і з суправаджэннем (згодна праграмным патрабаванням), прадэманстраваў валоданне рознымі відамі дырыжорскай тэхнікі ў адпаведнасці з характарам твораў і зместам мастацкіх вобразаў.

**2**. Выкананаць партытуру твора a cappella на фартэпіяна па - харавому.

**3**. Праспяваць са славамі на памяць, ці сальфеджыю адну з названых харавых партый, ці харавую лінію, 2-3 пачатковых, ці завяршаючых акорда (твор a cappella) па вертыкалі;

**4**. Адказаць на пытанні па мастацкаму і тэхнічнаму увасабленню харавых твораў (хар-ка творчасці кампазітара, паэта, змест твора, стыль, жанр, форма, роля суправаджэння, тэхнічныя, выканаўчыя складанасці і г.д.)

# КРЫТЭРЫІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**1-2 (адзін, два)** студэнт не ведае і не валодае 70% кампанентаў, якія адпавядаюць 10 балам. З'яўляецца прафесійна непрыгодным, не мае неабходных для навучання па дадзенай прафесіі ведаў, прыродных даных (музычнага слыху, рухальна-слыхавой кардынацыі, вакальных здольнасцей), навыкаў, не захоплены абранай прафесіяй, мае вузкі светапогляд, невысокі ўзровень мыслення і мастацкі густ.

**3 ( тры)** студэнт дэманструе недастатковае веданне асноўнага вучэбна-праграмнага матэрыялу. Дрэнна валодае элементамі дырыжорскай тэхнікі. Прадстаўленая праграма па дырыжыраванні выканана ім няўпэўнена і са значнымі скажэннямі аўтарскіх указанняў; няўпэўненыя, аднастайныя адказы на пытанні, неэрудыраванасць, адсутнасць мастацкага густу, арганізатарскіх і педагагічных здольнасцей.

**4 (чатыры)** атрымлівае студэнт за веданне асноўнага вучэбна-праграмнага матэрыялу. Прадстаўленая праграма па дырыжыраванні з двух твораў сярэдняй цяжкасці дэманструе пасрэднае валоданне дырыжорскай тэхнікай. Студэнт дапускае значныя памылкі пры дырыжыраванні. Выкананне харавой партытуры на фартэпіяна і вакальных партый прафесійна неграматнае. Адсутнічае эмацыянальная выразнасць. Адказы на пытанні маюць характар агульных звестак і не падмацаваны факталагічным матэрыялам, вузкі агульны кругагляд, нізкая эрудыцыя, пасрэдны мастацкі густ.

**5 (пяць)** атрымлівае студэнт за даволі поўнае веданне вучэбна-праграмнага матэрыялу, самастойнае засваенне асноўных формаў і метадаў работы з харавой партытурай. На прыкладзе двух твораў сярэдняй цяжкасці дэманструецца валоданне асобнымі элементамі дырыжорскай тэхнікі. Пры выкананні твораў дапускаюцца памылкі ў трактоўцы партытуры. Выкананне экзаменацыйнай праграмы па дырыжыраванні недастаткова эмацыянальна-выразнае. Адзначаецца веданне асноўнай літаратуры па праграме музычных дысцыплін. Адказы адпавядаюць зместу пытанняў, але маюць сур'ёзныя памылкі.

**6 (шэсць)** атрымлівае студэнт за даволі поўнае веданне вучэбна-праграмнага матэрыялу, самастойнае засваенне асноўных формаў і метадаў работы з харавой партытурай. На прыкладзе двух твораў сярэдняй цяжкасці дэманструецца валоданне асноўнымі сродкамі дырыжорскай тэхнікі, але іх практычнае выкарыстанне не адрозніваецца яскравай эмацыянальнай выразнасцю. Адзначаецца засваенне асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай. Пры адказах на пытанні дэманструецца агульнае валоданне матэрыялам, але дапушчана шмат недакладнасцей.

**7 (сем)** атрымлівае студэнт за даволі поўнае веданне вучэбна-праграмнага матэрыялу; практычнае валоданне сродкамі дырыжорскай тэхнікі. Прадстаўленая праграма павінна адпавядаць сярэдняму узроўню цяжкасці, могуць быць дапушчаны нязначныя памылкі. Адзначаюцца дакладная перадача тэксту аўтарскіх указанняў; разумение вобразнага

зместу, стылю і пабудовы твора; але недастаткова асэнсаванае выкананне розных па характеры музычных твораў; упэўненыя адказы на пытанні; пэўны мастацкі кругагляд, адзначаюцца разнастайныя веды па гісторыі музыкі, шырокі мастацкі кругагляд, адказы на пытанні дастаткова поўныя, але дапускаюцца памылкі.

**8 (восем)** атрымлівае студэнт за поўнае веданне вучэбна-праграмнага матэрыялу. На прыкладзе двух твораў сярэдняй цяжкасці дэманструецца вельмі добрае валоданне рознымі відамі дырыжорскай тэхнікі ў адпаведнасці з характерам твораў, але недастаткова выразна. Выкананне харавой партытуры на фартэпіяна і вакальных партый прафесійна граматнае. Адзначаюцца разуменне і адлюстраванне вобразнага зместу і стылю, эмацыянальная выразнасць выканання, асэнсаванае выкананне розных па характары музычных твораў (але недастаткова эмацыянальна выразна); дакладныя адказы на пытанні; дастаткова шырокі мастацкі кругагляд, агульная эрудыцыя і мастацкі густ.

**9 (дзевяць)** заслугоўвае студэнт за прадстаўленне дастаткова складанай праграмы па дырыжыраванні, усебаковае валоданне тэхнікай дырыжыравання і навыкамі самастойнага засваення ўсіх праграмных заданняў; эмацыянальна выразнае выкананне музычных твораў, розных па характары. Выкананне харавой партытуры на фартэпіяна і вакальных партый прафесійна граматна, па харавому. Дасканалы аналіз харавых твораў з пункту гледжання вобразнага строю і сродкаў музычнай выразнасці. Дакладныя адказы на пытанні; самастойнасць мыслення; шырокі мастацкі кругагляд, паслядоўнае лагічнае выкладанне матэрыялу, яскравае праяўленне асабістых прафесійных здольнасцей.

**10 (дзесяць)** заслугоўвае студэнт за ўсебаковае сістэмнае валоданне вучэбна-праграмным матэрыялам па курсу дырыжыравання. Прадстаўленая, дастаткова складаная праграма, павінна прадэманстраваць валоданне рознымі відамі дырыжорскай тэхнікі ў адпаведнасці з характарам твораў і зместам мастацкіх вобразаў; свабоднае валоданне фартэпіяна на высокім ўзроўні, спевы галасоў і акордаў інтанацыйна чыста, па харавому. Грунтоўныя адказы на пытанні, глыбокае засваенне асноўнага і дадатковага матэрыялу. Наяўнасць выразных прафесійных здольнасцей, самастойнага мыслення, багатай фантазіі, мастацкага густу; глыбокае веданне сусветнай і айчыннай мастацкай культуры.